След на зямлі

# І Ў СВАЕ 100 ЁН ПА-РАНЕЙШАМУ ДАЕ ЎРОКІ!

**...Знаёмства і кожная сустрэча з Уладзіславам Мікалаевічам ВАСІЛЬЕВЫМ — былым выкладчыкам нашага аграрна-тэхнічнага каледжа — рэдкая ўдача, а то і шчасце, бо ён заўсёды шчыры, сабраны, адказны, з выключным пачуццём гумару, з уменнем гаварыць душой... Зусім нядаўна, 5 жніўня, ветэрану вайны і педагагічнай працы споўнілася 100 (?!), і ці не ўсе гэтыя гады прысвечаныя стварэнню.**

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Уладзіслаў Мікалаевіч быў маладзейшым за сённяшніх навучэнцаў каледжа, жыў з сям'ёю на поўначы. У 1942-м, скончыўшы 10 класаў і Кузнецкае кулямётнае вучылішча, разам з іншымі выпускнікамі трапіў пад Ленінград, у Другую ўдарную армію генерала Уласава, а калі па шчырасці — то ў самае сапраўднае пекла. Навабранцам не хапала прадуктаў, абмундзіравання, боеприпасаў, а Васільеву да таго ж не пашчасціла з вінтоўкай. «Яна няспраўная... Як быць?» — спытаў у «бацькоў-камандзіраў». «Лепшую знойдзеш там», — сказалі яму ў адказ і паказалі ў той бок, дзе грымеў бой, дзе было шмат забітых і таварышаў, і ворагаў, дзе заставалася ўжо непатрэбная ім зброя.

У першы дзень верасня тога самага 1942-га Уладзіслаў Мікалаевіч быў паранены ў руку і досыць цяжка — у шыю. Аднак і ў гэткім стане (раненых было шмат) разлічваць мог толькі на сябе, на ўласныя сілы. І таму, нягледзячы ні на што, змог адолець начны 15-гадзінны пераход па забалочанай мясцовасці...

Пасля ранення яму доўга давялося ляжаць у шпіталі, многае передумаць, канчаткова зразумець, як жа нялёгка забіваць людзей, хоць яны і ворагі.

Ветэрану да сёння цяжка ўспамінаць і час сваёй службы ў блакадным Ленінградзе, калі на суткі давалі 125 грамаў хлеба, калі...

Жахі блакады досыць падрабязна апісаны ў гістарычнай і мастацкай літаратуры. Іншая рэч — успаміны жывых людзей. Ва Уладзіслава Мікалаевіча дагэтуль у памяці, як гарэлі склады з прадуктамі харчавання, як плавіўся цукар, а людзі потым збіралі зямлю, на якую ён выцякаў, разводзілі вадой, гатавалі і пілі брудную салодкую вадкасць, каб хоць неяк падтрымаць сілы.



Калі ў горад прыехаў К. Я. Варашылаў, Уладзіславу Мікалаевічу давялося яго ахоўваць. Праз некалькі гадоў пасля вайны ён убачыў гэты сюжэт у фільме «Блакада».

...Пасля таго як яе прарвалі, стала хоць трохі лягчэй, але вайна працягвалася, і гінулі ў ёй не толькі грады і людзі. Ветэран часта ўспамінае адно з наступленняў немцаў. Іх, ворагаў, паводле загаду камандавання, трэба было падпусціць як мага бліжэй. А ў лесе гармата страляе прама, і снарад часцяком трапляе ў дрэвы. Па словах ветэрана, вусцішна глядзець было, як яны тады падскоквалі і падалі на зямлю.

...У 1944-м франтавіка Васільева адправілі ў Ленінград на курсы, дзе рыхтавалі сакрэтную «каманду восем», якая збірала шыфравальную інфармацыю ворага. Зразумела, што курсантамі станавіліся толькі найлепшыя з найлепшых — тыя, хто заслужыў асаблівы давер.

Чым? Сваёй падрыхтоўкай, працай, учынкамі. Ва ўмовах вайны, як кажа ветэран, досыць хутка праяўляюцца характары, бо чалавек там проста не можа прыкідвацца...

Радасную вестку аб Перамозе Уладзіслаў Мікалаевіч пачуў будучы ў Прыбалтыцы, але дамоў вярнуўся толькі ў 1946-м і з моцна падарваным здароўем. Кантузіі і раненні, якія атрымаў на вайне, нагадвалі пра сябе яшчэ вельмі доўга. І ўсё ж ён дакладна ведае (і заўсёды кажа маладым), што ўсё ў яго жыцці атрымалася б значна горш, калі б ён быў слабым фізічна...

А таму нават сёння ветэран працуе над сабой, усе свае веды і ўменні стараецца перадаць маладому пакаленню. Балазе магчымасць такая ў яго заўсёды і ёсць, і была, бо пасля вайны Уладзіслаў Мікалаевіч паступіў у сельскагаспадарчы інстытут, скончыў факультэт землябробства і геадэзіі, стаў працаваць выкладчыкам у Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме.

Сцены яго карпусоў і чытальнай залы дагэтуль упрыгожваюць карціны: Уладзіслаў Мікалаевіч усё жыццё малюе мясцовыя краявіды, цудоўна фатаграфуе. У яго пасёлку Мар'іна ды ваколіцах няма, відаць, ніводнай хаты, ніводнай сям'і, для якой бы мастак не рабіў фотаздымкаў...

У яго багатая бібліятэка, якую разам з сям'ёю збіралі ўсё жыццё. Выпускнікі ўспамінаюць, якім ён быў класным кіраўніком, як са сваёй групай ставіў, у прыватнасці, п'есу Васіля Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі»: дэкарацыі ствараў сам, касцюмы шылі маці і жонка...

Але ж ці не галоўнай справай мірнага жыцця ветэран лічыць добраўпарадкаванне брацкай магілы ў сваім пасёлку. Гэтай справай ён займаўся разам з навучэнцамі і сакратаром камсамольскай арганізацыі Віктарам Паўлоўскім, каб захаваць памяць пра тых, хто стаў на абарону Радзімы і не сустрэў Перамогу.

...Яшчэ нядаўна Уладзіслаў Мікалаевіч і ў святы, і ў будні быў частым госцем у каледжы. Цяпер гасцей прымае сам: яго дзверы заўсёды адчынены для родных, сяброў і суседзяў, навучэнцаў каледжа, выкладчыкаў. І з кожным, хто заходзіць, гаспадар гатовы дзяліцца ўспамінамі, ведамі, досведам. Можна сказаць, што ён па-ранейшаму дае ўрокі — такія патрэбныя для годнага жыцця чалавека, якому дарагія яго сям'я і яго радзіма.

**Алена Свірыдава,**
**выкладчыца,**
*г. Мар'іна Горка,*
*Пухавіцкі раён.*

Перажытае — незабытае

# ФРОНТ ЗА ЛІНІЯЙ ФРОНТУ

**Ні ў адной краіне свету, ні ў адной рэспубліцы былога Савецкага Саюза ў час Другой сусветнай вайны не было столькі партызан, колькі ў Беларусі: сотні брыгад і атрадаў, у якіх змагаліся звыш 370 тысяч народных мсціўцаў: можна сказаць, сапраўдны фронт у тыле ворага...**



М. І. Жукоўскі.

У нашым раёне дзейнічала 18 партызанскіх палкоў, 9 брыгад. Наш зямляк (ураджэнец вёскі Пагост) Максім Іванавіч Жукоўскі адным з першых сярод народных мсціўцаў ва ўсім Савецкім Саюзе і ў першыя ж месяцы вайны быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Сярод партызан Бярэзіншчыны значыцца і грамадзянін Францыі Раман Дзюбаст. У Беларусь ён трапіў не па добрай волі: яго прымусілі надзець ваенную форму пад пагрозай пакараць родных, пагналі на ўсход, на ўздзел у карных экспедыцыях. Аднак пад нямецкім шынялём білася сэрца чалавека, які толькі чакаў зручнага моманту, каб перайсці на бок партызан. І такі выпадак надарыўся: хлопец стаў байцом атрада імя Шчорса.

Вясёлага і мужнага француза, які ніколі не хаваўся за спіны іншых, любіў спяваць савецкія песні (любімая — «Тры танкісты») і марыў пасля вайны вырошчваць буракі, хутка палюбілі партызаны. Але да светлага дня Перамогі ён не дажыў: 10 кастрычніка 1943-га нёс патрульную службу каля вёскі Марысіна, заўважыў на дарозе калону немцаў, адправіў таварыша ў штаб з данясеннем, а сам распачаў бой...

Імя адважнага партызана Рамана Дзюбаста значыцца на помніку ў скверы райцэнтра.

...Камандзірам партызанскай роты стаў былы чырвонаармеец Дзмітрый Барысавіч Шрэйн. На чале з ім для ўстанаўлення сувязі з ЦК КПБ і Беларускім штабам партызанскага руху ў Маскве адважныя партызаны перайшлі лінію фронту, абмінаючы варожыя гарнізоны, адолелі шлях у 600 кіламетраў.



Дз. Б. Шрэйн.

Начальніку штаба Дзмітрый Барысавіч даваў тады інфармацыю аб дзеяннях партызан у Асіповіцкім раёне, пасля чаго тая ж група адважных — ужо з радысткай і радыёстанцыяй, з інструктарамі-падрыўнікамі — накіравалася назад у атрад.

Баявы шлях Дз. Б. Шрэйна адзначаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені. У мірны час персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння працаваў у леспрамгасе, начальнікам Бярэзінскага сплаўучастка.

...На авіяцыю ў пачатку вайны партызаны разлічвалі мала, аднак з вясны 1942-га становішча стала мяняцца. Народныя мсціўцы Бярэзінска-Клічаўскай зоны прымалі грузы на аэрадроме каля вёскі Галынка, а дастаўлялі іх авіятары пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза гвардыі палкоўніка Валянціны Грызадубавай. «Што тут рабілася!» — пісаў пра пасадку першага самалёта былы партызан Мікалай Ратушнаў. Абдымкі, пацалункі, радасныя воклічы!.. У кожнага было жаданне не толькі бліжэй убачыць, але і дакрануцца да лётчыкаў, да самалёта, упэўніцца, што гэта не сон, а самая сапраўдная ява.

У ноч на 17 сакавіка 1943 года з тога ж аэрадрома Галынка экіпажам Сцяпана Запылёнава быў вывезены адмысловы стол, які ў вёсцы Нядашкава (непадалёк ад Магілёва) змайстраваў столяр-чырванадрэўшчык Якаў Арлоў. Яго мазаічныя самабытныя вырабы з розных парод дрэва адзначаліся ўзнагародамі на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай — у Маскве... Да 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў падарунак Сталіну майстар вырашыў зрабіць двухтумбавы пісьмовы стол з адпаведным дароўным надпісам.

Вайна прыпыніла работу ўмельца, аднак фашысты неяк чынам дазналіся пра схаваны ў хляве падарунак і вырашылі адправіць яго Гітлеру — загадалі былы надпіс змяніць на новы «Вялікаму фюрэру Гітлеру ад беларускага народа ў знак удзячнасці за вызваленне».

Фотаздымкі гэтага падарунка былі змешчаны ў нямецкіх газетах, з Берліна да Арлова прыязджалі нямецкія чыноўнікі, захапляліся. Акрамя стала патрабавалі, каб Арлоў зрабіў для Гітлера і адмысловае крэсла.

Падарунак хацелі даставіць у Германію да дня нараджэння фюрэра, таму ўмельца, можна сказаць, не выпускалі з хаты... Але ж сакрэты ў вёсцы не жывуць. Патрыёты ўстанавілі сувязь з партызанскім атрадам. Дачакаўшыся ночы, народныя мсціўцы ўзвода разведкі Івана Пархаўчанкі ў цемрані падышлі да хаты Арлова, знялі вартавога, стол разабралі, паклалі на санкі і разам з майстрам, які папрасіўся ў партызанскі атрад, выехалі з вёскі.

Фашысты былі раз'юшаны: каб вярнуць абяцаны падарунак Гітлеру, яны задзейнічалі сваю авіяразведку, прачэсвалі ўсе навакольныя лясы. Аднак пошукі аказаліся марнымі.

Пасля вайны замест дароўных надпісаў майстар зрабіў на стальніцы прыгожы арнамент і незадоўга да смерці перадаў свой шматпакутны твор у Магілёўскі абласны краязнаўчы музей.

**Тамара Круталевіч,**
*г. Беразіно.*

Чалавек — чалавеку

# «БЕЗ МЯНЕ РАЗГУЛЯЕЦЦА ВОСЕНЬ...»

**У мяне што ні жнівень, то балючы ўспамін: сёлета 23 гады як на вучэннях у Баранцавым моры затанула падводная лодка «Курск». Большасць падводнікаў загінула адразу, 23 чалавекі заставаліся ў жывых...**

У той жа дзень мы, прыхаджане храма Святога Георгія Пераможцы, выпраўляліся ў паломніцкую паездку ў далёкае Дзівеева да бацюшкі Серафіма Сароўскага. У салоне аўтобуса быў тэлевізар для прагляду духоўных фільмаў, выпускаў навін. З іх і даведаліся, што адбылася трагедыя, сталі маліцца і, вядома ж, спадзявацца на лепшае.

Па прыездзе на месца за навінамі мог сачыць толькі бацюшка. Кожны дзень пасля літургіі ён расказваў, што адбываецца на субмарыне. Паведамленні былі сухія і кароткія, але ж надзея пакуль жыла...

Раніцой 19 жніўня, перад ад'ездам дамоў, мы сабраліся на богаслужэнне. У 12 гадзін яно завяршылася, але святары (24 чалавекі... у белым адзенні...) сталі выходзіць з алтара толькі ў 12 гадзін 30 хвілін. Пачалася незапланаваная паніхіда, і мы, вернікі, зразумелі ўсё...

Я стаяла з правага боку. У нейкі момант выцерла слёзы і здрыганулася, убачыўшы незвычайнае срэбнае свячэнне. Нібы сотні маленькіх сняжынак кружыліся ў паветры над галовамі святароў...

Трохі пазней я ім расказала пра гэта і пачула, што душы загінулых адразу ж узнесліся на Нябёсы. Ды і ці магло быць інакш у пакутнікаў нашага часу? А тады...

Мы плакалі, перажывалі сыход, уяўлялі, як жа цяжка іх родным!

Каб хоць нечым падтрымаць іх, па дарозе дамоў я напісала верш «Пісьмо да матулі». Мне здаецца, што сваёй актуальнасці ён не страціў і сёння.

*Ты прабач мяне,*
*мамачка, мама!*
*Мы не стрэнемся*
*болей з табой*
*Каля нашай*
*вяргіневай брамы...*
*Пад старою*
*не сядзем вярбой.*
*Год за годам прайшлі*
*мае дваццаць,*
*Нібы кадры нямога кіно.*
*Не паспеў у каханні*
*прызнацца*
*Той, з якой сябравалі*
*даўно.*
*...Без мяне*
*разгуляецца восень:*
*Журавіны —*
*як кроплі крыві.*
*Сэрца сціха*
*і стомлена просіць:*
*— Ты не плач,*
*ты яшчэ пажыві!*
*...Вось і ўсё.*
*Замірае дыханне.*
*Вусны шэпчуць*
*ужо ў небыцці,*
*Як апошняе развітанне:*
*— Мама, ма...*
*Усё роўна*
*жыві!*

**Наталля Сівак,**
*в. Заполле,*
*Чэрвеньскі раён.*